# БІЛЯ ДЖЕРЕЛ СЛОВ'ЯНСЬКИХ КУЛЬТУР

**УДК 398.332+398.82](476)**

***Валянціна Новак***
***(Гомель, Рэспубліка Беларусь)***

## ВЕСНАВЫЯ І ЛЕТНІЯ АБРАДЫ І ПЕСНІ БРАГІНСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

У статті охарактеризовано окремі жанри весняної і літньої календарної обрядової поезії одного з районів Гомельської області – Брагінського, на території якого 2018 року було проведено фольклорну експедицію. Розглянуто місцеві особливості побутування таких обрядів, як обряд зустрічі весни, Великдень, Юр'їв день, Трійця, водіння русалки, Купали, «зажинки», «завивання бороди».
**Ключові слова:** обряд, календарно-обрядова поезія, народні вірування, великодній обрядовий комплекс, жнивні обряди, троїцько-семіцькі обряди, локальні особливості.

Separate genres of spring and summer calendar ritual poetry of Brahin district in Gomel region are described in the article. Folklore expedition has been held on its territory in 2018. The local peculiarities of existence of such rites as the ceremony of Spring meeting, Easter, George's (Yuriy's) Day, Trinity, leading of a mermaid, Kupala, reaping starting (zazhynky), harvest festival (zavyvannia borody), are considered.
**Keywords:** rite, calendar-ritual poetry, folk beliefs, Easter ritual complex, harvesting rites, Trinity-Semitz rites, local peculiarities.

Каляндарна-абрадавы фальклор Гомельскай вобласці вылучаецца багаццем мясцовай спецыфікі, пра што сведчаць штогадовыя палявыя экспедыцыі, якія праводзяцца ў розных раёнах рэгіёна. Запісаныя матэрыялы пра абрады і песні, звязаныя з рознымі цыкламі земляробчага календара, пераконваюць у тым, што надзвычай устойліва захоўваюцца

ў народнай памяці звесткі пра з’явы зімовай і веснавой абраднасці. Што да традыцый веснавога цыкла земляробчага календара, то назіраецца адметная геаграфія іх бытавання на тэрыторыі Гомельшчыны. Паколькі фальклор як від мастацтва бытуе на мясцовым узроўні, то гэтым і тлумачыцца арганізацыя мэтаскіраванай сістэматычнай работы па экспедыцыйным даследаванні і тэарэтычным асэнсаванні фальклорна-этнаграфічных традыцый кожнага з раёнаў Гомельскай вобласці. Адна з такіх экспедыцый была праведзена ў ліпені 2018 года ў вёсках Брагінскага раёна. Засяродзім увагу на характарыстыцы веснавых і летніх абрадаў і звычаяў.

Варта адзначыць, што сціплыя звесткі запісаны пра абрад гукання вясны, які на тэрыторыі Брагіншчыны выконвалі ў розны час: на 1 сакавіка па старым стылі («На Еўдокі (14 марта, новы стыль), кажа, это ўжо вясна прыходзіць» – запісана ў в. Краснае ад Фядосенка Настассі Пятроўны, 1943 г. н., перасяленкі з в. Капоранка), 25 сакавіка (па старым стылі) на Дабравешчанне («Благавешчанне», 7 красавіка, новы стыль). Сярод найбольш важных кампанентаў гэтага абрадавага комплексу вылучаюцца такія, як выхад на высокае месца («Вясну звалі на ўзвышаным месцы» – запісана ў в. Лубенікі ад Гайдук Ганны Севасцьянаўны, 1922 г. н.), распальванне вогнішча («Кастры палілі» – запісана ў в. Буркі ад Шкурко Ганны Адамаўны, 1926 г. н.), выбар дзяўчыны на ролю вясны («Тады выбіралі дзевачку-вяснянку. Надзявалі ёй вянок. Хадзілі ў харавод» – запісана ў в. Буркі ад Раманюк Марыі Адамаўны, 1930 г. н.), выкананне песень-вяснянак.

Надзвычай папулярным на Брагіншчыне было веснавое свята Вялікдзень, за якім у народным календары не было замацавана пастаяннае месца. Звесткі, запісаныя ў розных вёсках пра гэта свята, даюць магчымасць назваць асноўныя структурныя кампаненты велікоднагага абрадавага комплексу: рытуалы, звязаныя з Чыстым чацвяргом, выпечка абрадавага

хлеба – «паскі», фарбаванне яек, наведванне начной святочнай службы ў царкве, асвячэнне прынесеных жыхарамі велікодных страў («паскі, яек і інш.), рытуалы, звязаныя з яйкамі, звычай наведваць хроснымі сваіх «хрышчанят».

Што да Чыстага чацвярга, то жыхары імкнуліся навесці парадак не толькі ў хаце, але і на падворках: «<...>трэба было навесці вялікі парадак і ўборку ў дварэ і хаце: пабяліць, памыць, падгрэбці, падмясці, вымясці смецця. Самім памыцца ў бані» (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва ад Цярэшчанка Таццяны Іванаўны, 1930 г. н.); «Перэд Паскаю трэбо було ў Чысты чацвер повымуваць подлогу, побеліць печ, пасціраць гардзіны, вымесці двора і сомім помыцца» (запісана ў в. Шкураты ад Саракаумавай Надзеі Раманаўны, 1948 г. н.).

Звычайна ў суботу, якую называлі «чырвонай», рыхтавалі абрадавыя стравы да святочнага велікоднага застолля. «Тыдзень ад Вербніцы да Вялікадня ў асобных вёсках Брагінскага раёна носіць назву “Красная нядзеля”» [2, с. 186]. Паводле сведчанняў жыхароў в. Зарэчча, «у Красную суботу красілі яечкі, пеклі паску, варылі святочную яду» (запісана ад Фраловай Кацярыны Дзмітрыеўны, 1913 г. н.). І сёння фарбаванне яек – важны момант у мясцовай велікоднай абраднасці. У асноўным фарбавалі яйкі ў чырвоны колер, тлумачылі, што «эта як сімвал калісьці такі, у цэркві расказваў бацюшка. Красныя яечкі кідалі – сімвал, што васкрэс Гасподзь Ісус Хрыстос» (запісана ў в. Малажын ад Харко Валянціны Аляксандраўны, 1939 г. н.). Паводле сведчанняў Марыі Іванаўны Дземідок, 1941 г. н., з в. Аляксееўка, «у красны цвет красіліся, як Хрыста распіналі, то была кроў». «Фарбаванне велікодных яек у чырвоны колер мела на мэце ўзмацніць гэты пачатак, вылучыць яго. Хрысціянства, пераасэнсоўваючы язычніцкую сімволіку ў адпаведнасці са сваімі ўяўленнямі і догматамі, тлумачыла ўжыванне чырвоных яек як далучэнне да радасці ў сувязі з уваскрэсеннем Хрыста» [1, с. 45].

Зыходзячы з народных вераванняў, забаранялася фарбаваць яйкі ў чырвоны колер, калі памёр хто-небудзь з членаў сям'і: «…а калі ў кого-небудзь у сям'е нядаўно помер чоловек і не прошло сорок дней, яйцо красіць у красны цвет нельзя» (запісана ў в. Шкураты ад Саракаумавай Надзеі Раманаўны, 1948 г. н.).

Наведванне храма было абавязковым падчас велікодных святкаванняў: «На Вялікдзень усю ноч правілі ў цэркві, пакуль Ісуса Хрыста падымуць. Стаялі ў цэркві ўсю ноч» (запісана ў в. Лубенікі ад Гайдук Ганны Севасцьянаўны, 1922 г. н.). Наведванне царкоўнай службы, верылі, паспрыяе захаванню здароўя, дабрабыту: «Хто на Усяночную ўсю ноч прастаіць у царкве, таму Гасподзь пашле здароўе, і дабра на ўвесь год, і ўдачы. Паэтаму людзі не засыпалі. Як ужо спаць хацелі, а не засыпалі. Пасьцелі пазапраўляюць зь вечара і ніхто не прысядзе і не пparticular ляжа для таго, штоб Гасподзь даў здаровейка. І абязацельна людзям этым была ўдача хоць у чым» (Анастасія Раманавец, 1932 г. н., в. Новы Пуць, Брагінскі раён) [2, с. 193]. Лічылася, што, хто раней прыйдзе з царквы і пачне разгаўляцца, «…будзе ў гэтым годзе ўдача ў яго справах і добрае здароўе» (запісана ў в. Зарэчча ад Іотчанка Яўгеніі Іванаўны, 1928 г. н.).

Пасля прыходу з царквы разгаўляліся асвечанымі ў царкве яйкамі, «паскай» і мяснымі стравамі: «З етай асвечанай яды і начыналася первае снеданне» (запісана ў в. Зарэчча ад Фраловай Кацярыны Дзмітрыеўны, 1913 г. н.). У мясцовай традыцыі было прынята перад пачаткам святочнага застолля абавязкова «ўмыцца крашаным яечкам. Хто клаў яго ў святую ваду і мыўся вадой, а хто качаў яечка па твары» (запісана ў в. Зарэчча ад Фраловай Кацярыны Дзмітрыеўны, 1913 г. н.).

Гульня ў біткі і качанне яек з горкі – важныя рытуалы ў велікоднай абраднасці беларусаў – выконваліся спрадвеку і на брагінскай зямлі: «На гэта свята гулялі ў біткі. Калі моё

яйка разбілась, тады я аддаю сваю бітку. У нашай мясцовасці качалі яйкі з горкі. Пераможцам у гэтай гульні быў той, чыё яйка пакоціцца далей» (запісана ў в. Лубенікі ад Гайдук Ганны Севасцьянаўны, 1922 г. н.). «Раньша, ой гулялі ў біткі, выходзілі на вуліцу, асобенно мужчыны, надзявалі свае сапагі хромавыя, гальхве, рубашкі вышываныя, з паясамі, шапкі – і ідуць гуляць у біткі. І такія яны ўжо давольныя, каторы наўбівая, каторы разумны, дак зробіць неяк яйцо і наўбівая, прынясе дамоў тых яіц – дак ого! Радаваліся людзі» (Анастасія Раманавец, 1932 г. н., в. Новы Пуць, Брагінскі раён) [2, с. 199]. Жыхары в. Чамярысы верылі, што ўладальнік яйка-«мацака» (самага трывалага) «шчаслівы і здаровы будзя» (запісана ад Краўчанка Марыі Яўхімаўны, 1929 г. н.). Паводле ўспамінаў жыхароў в. Малажын, качанне яек з горкі ў іх мясцовасці адбывалася на так званай «Лысай гары»: «І іменна кажды качае яечка сваё з гары ўніз, і чые яечка разаб’ецца, значыць, той праіграў» (запісана ад Харко Валянціны Аляксандраўны, 1939 г. н.).

Той факт, што велікодныя абрады і звычаі мелі адметную мясцовую семантыку, пацвярджаецца наступнымі сімвалічнымі засцерагальнымі і прадуцыравальнымі дзеяннямі: закопванне шалупаек з пасвечаных велікодных яек у агародзе («Шкарлупу с яек і ўсяго па чуць-чуць свёкар звязваў у вузялок і закопваў у агародзе, і там яна была да градавай серады, штоб расценія не пабіў град») (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва ад Цярэшчанка Таццяны Іванаўны, 1930 г. н.)), кіданне пасвечаных шалупаек ад яек у баразну («Пасвячоныя скарлупкі, як гарод сеяш, так кідаюць ў боразну», «Таксама і свінням даюць» (запісана ў в. Рыжкаў ад Баранавай Валянціны Сцяпанаўны, 1941 г. н.)).

Абавязковым у мясцовай велікоднай абраднасці было наведванне могілак: «На могілкі хадзілі, клалі яйкі мёртвым і булку. Убіралі могілкі. Сабіраліся з родзічамі і частаваліся каля могілак» (запісана ў в. Сцежарнае ад Рэмізевіч Раісы

Уладзіміраўны, 1941 г. н.). Другі дзень святкавання Вялікадня быў звязаны з узаемным наведваннем кумоў і хроснікаў, бабкі і яе ўнукаў. Гэты звычай атрымаў назву хадзіць «у валачона»: «Дзеці з вузелкамі шлі к хросным у валачона. Маці наложыць у вузелок каждаму яйца крашаные, трохі канфет, булачку» (запісана ў в. Шкураты ад Саракаумавай Надзеі Раманаўны, 1948 г. н.). У вёсцы Дуброўнае на другі дзень Вялікадня звычайна не толькі наведвалі хрэснікаў, але і зяць заўсёды прыходзіў у госці да цёшчы: «У каго былі зяці, дык к цёшчам хадзілі. І вот прыходзяць зяці, затым хроснікі ідуць, ідуць» (запісана ад Міхаленка Вольгі Якаўлеўны, 1932 г. н.). У вёсках Зарэчча, Малейкі, Сялец хросныя прыносілі «валачобнае» сваім хрэснікам. Паводле ўспамінаў Фраловай Кацярыны Дзмітрыеўны, 1913 г. н., з в. Зарэчча, «у еты ж дзень кумаўе носіць сваім хрышчонікам валачобнае». Асобныя запісы звестак пра Вялікдзень (у вёсках Зарэчча і Лубенікі) даюць падставы меркаваць, што калісьці тут мела месца традыцыя абходу падвор'яў валачобнікамі: «На другі дзень Пасхі хадзілі валачобнікі. Я валачобных песень ужэ не помню, толькі радочкі» (запісана ад Фраловай Кацярыны Дзмітрыеўны, 1913 г. н.); «На трэці дзень Вялікдня хадзілі валачобнікі. Больш ім давалі яечкі» (запісана ад Гайдук Ганны Севасцьянаўны, 1922 г. н.).

Юраўскі абрадавы комплекс на Брагіншчыне мае як земляробчую скіраванасць, так і жывёлагадоўчую. Земляробчы цыкл юраўскай абраднасці найперш быў прадстаўлены абрадам абходу нівы, калі «бралі баханачку хлеба, пяклі яе, у палаценца ўвёртвалі ды й хадзілі палосы зямлі сваёй абыходзіць. Абходзілі, глядзелі, які ўраджай будзе» (запісана ў в. Дуброўнае ад Міхаленка Вольгі Якаўлеўны, 1932 г. н.). Выконвалі гэты абрад і жыхары ў іншых мясцовасцях, напрыклад, у г. п. Камарын «селянін клапаціўся пра сваю ніву. Ён абходзіў сваю ніву з хлебам, загорнутым у абрус. Утыкаў

асвячоную ветачку ў зямлю з верай, што яго ніву міне град» (запісана ад Талкачовай Таццяны Васільеўны, 1932 г. н.).

«У земляробчых звычаях Юр'я трымаецца прадпісанне садзіць агуркі: "На Юр'я мама ўсягда садзіла первыя агуркі, а тады ўжо на Міколу, двацццаць втарога мая" (Надзея Ліцвіненка, 1946 г. н., в. Буркі, Брагінскі раён)» [2, с. 216]. Паводле сведчанняў Лук'янавай Глафіры Мікалаеўны, 1938 г. н., з в. Малейкі, 6 мая, «у еты дзень сеялі на гародзе гуркі. Кажуць, што толькі пасажаныя на Юрыю гуркі даюць добры ўражай».

Пра абрад першага выгану жывёлы ў поле запісана больш звестак, што сведчыць пра актыўнасць яго бытавання. Як правіла, выганялі карову ў поле, выкарыстоўваючы хлеб, соль і галінкі пасвечанай вярбы: «Бралі вербачку тую, што перад Паскаю за нядзелю свецяць. І вербачку тую ўвёртвалі ў палаценца з хлебам і ўганялі скацінку ў поле, штоб Бог даў, штоб усё було благапалучна, нармальна, здаровенька худоба була, хадзіла на поле» (запісана ў в. Дуброўнае ад Міхаленка Вольгі Якаўлеўны, 1932 г. н.). Сярод абрадавых дзеянняў, звязаных з юраўскай абраднасцю, вылучаецца рытуал «падразання» хваста карове («Утрам, да ўсходу сонца, абразалі каровам хвасты») (запісана ў в. Малейкі ад Краўчанка Ганны Паўлаўны, 1935 г. н.). Як патлумачылі жыхары, выкананне гэтага дзеяння мела магічнае значэнне: «Як адрастае хвост, так хай прыбывае малако» (запісана ў в. Малейкі ад Лук'янавай Глафіры Мікалаеўны, 1938 г. н.). Пад парогам хлява закопвалі яйкі, каб «скацінка была такая ж гладкая і круглая, як яйка» (запісана ў в. Верхнія Жары ад Луччы Ганны Фёдараўны, 1930 г. н.).

Да юраўскага свята ў в. Мікулічы рыхтавалі абрадавае печыва ў выглядзе фігур свойскіх жывёл, каб ушанаваць святога Юр'я, што не было выпадковым, бо верылі, што «сам Ягорка ездзіць па полі на белым кані» (запісана ад Сокаравай Марыі Андрэеўны, 1920 г. н.). Прыгадвалі мясцовыя жыхары

і пра ваджэнне на Юр'я карагодаў: «А було шчэ, што маладыя дзевушкі і хлопцы карагоды вадзілі і песні спявалі» (запісана ў в. Дуброўнае ад Міхаленка Вольгі Якаўлеўны, 1932 г. н.).

Святкаванне Тройцы на Брагіншчыне звязана найперш з упрыгожваннем зелянінай хаты і падвор'яў. У мясцовай абрадавай практыцы перавага аддавалася ўстаноўцы такіх дрэў, як клён і бяроза: «Свёкар ссякаў тры клёны малодзенькія і ставіў ля дзвярэй у хату і пад вокнамі» (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва ад Цярэшчанка Таццяны Іванаўны, 1930 г. н.), «На Троіцу абязацельна вырубалі дзеревца і ўкапывалі возле варот і пад окнамі бярозку» (запісана ў г. п. Камарын ад Шаўчэнка Алы Мікалаеўны, 1929 г. н.). Выкарыстоўвалі для святочнага аздаблення падвор'яў, з мэтай засцярогі і асобныя галінкі бярозы і клёна, калі іх «ставілі перад уваходам у вароты, у шулу, абавязкова ўтыкалі перад хлевам» (запісана ў в. Шкураты ад Прыходзька Праскоўі Паўлаўны, 1937 г. н.). У в. Сцежарнае, зыходзячы з народных вераванняў, засцерагаліся ад звышнатуральнага ўздзеяння ведзьмы: «У хаце ля ікон ставілі ліпавыя веткі, у дваре вешалі, затыкалі ў вароты. Калісь казалі, штоб ведзьмы не праходзілі» (запісана ад Савянок Марыі Ільінічны, 1943 г. н.).

Па стану зеляніны, зыходзячы з традыцыйных народных вераванняў, меркавалі аб тым, наколькі ўраджайным будзе год: «І вот ета зелень дажа за адні суткі еслі яна пастаіць і саўвяне, то, значыцца, ета будзе сухі год, а іншы раз стаіць доўга зялёна.., гэта значыцца, сільна мокрае лета будзе» (запісана ў в. Дуброўнае ад Міхаленка Вольгі Якаўлеўны, 1932 г. н.). Мясцовыя жыхары надавалі магічнае значэнне траецкай зеляніне, якая валодала ўласцівасцямі ўплыву на ўрадлівасць зямлі і агароднінных культур: «У нас на Тройцу хадзілі на поле: рабілі вянкі, насілі на агарод, лажылі на капусту, на адну галоўку, штоб капуста вялікая расла» (Надзея Ліцвіненка, 1946 г. н., в. Буркі, Брагінскі раён) [2, с. 238].

У в. Малейкі высцілалі «плюшнікам» падлогу, каб «жылося добра ў хаце, штоб хазяйства вялося, штоб у двор толькі добрыя людзі хадзілі» (запісана ад Краўчанка Ганны Паўлаўны, 1935 г. н.). У в. Малажын «маем» называлі галінкі клёна, ліпы і бярозы, якія «развешвалі» як абярэг у хаце, на двары, каля варот, каб засцерагчыся ад «злых духаў» (запісана ад Філон Тамары Тарасаўны, 1946 г. н.). «Май у нас – ліпа. З ліпы рабілі вяночкі, і так ставілі і ў вокны, і ў хаце» (Надзея Ліцвіненка, 1946 г. н., в. Буркі, Брагінскі раён) [2, с. 237].

На вялікі жаль, сустрэліся на Брагіншчыне адзінкавыя запісы звестак пра траецкі абрад завівання вянкоў, калі дзяўчаты, знайшоўшы ў лесе «дзве тонкія бярозкі, якія стаялі радам, і завязвалі іх вярхушкі, а патом хадзілі пад гэтай» (запісана ў в. Сцежарнае ад Рэмізевіч Раісы Уладзіміраўны, 1941 г. н.).

Наступны тыдзень у мясцовым народным календары пасля Сёмухі называлі Русальным: «Наступная нядзеля пасля Сёмухі звалася Русальнай» (запісана ў в. Буркі ад Раманюк Марыі Адамаўны, 1930 г. н.). Абрад праводзін русалкі адбываўся ў некаторых вёсках адразу пасля Тройцы-Сёмухі, а ў іншых – на Купалле. Калі ў вёсках Буркі, Кавалі, Дуброўнае, Новы Шлях, Лубенікі, Сцежарнае, Зарэчча і інш. праводзілі русалку ў жыта, то ў в. Пасудава «калі "русалак" на могілкі вялі, вось так у шырэнгу за рукі браліся і пелі песні» (запісана ў в. Карлаўка ад Макарак Ніны Рыгораўны, 1930 г. н., перасяленкі з в. Пасудава). У мясцовай русальнай традыцыі названай вёскі мелі месца такія адметныя рысы, як пераапрананне жанчын («былі ў адных белых сарочках, косы распускалі, як русалкі»), абход імі могілак (тры разы), стуканне вянкамі па крыжах (тры разы).

Паводле сведчанняў жыхароў в. Ясяні, звычайна плялі тры вянкі: «Дзелалі па тры венкі: адзін вянок лажылі на капусту, а другі пускалі на ваду, трэці адзявалі на галаву, і ўжо вадзілі русалку» (запісана ў в. Негаўка Буда-Кашалёўскага раёна

ад Мартыненка Марыі Сцяпанаўны, 1929 г. н., перасяленкі з в. Ясяні Брагінскага раёна). Варта адзначыць, што наяўнасць вянка ў абрадзе праводзін русалкі – важны элемент яе ўбранства, а дзеянні, звязаныя з ім, з'яўляліся доказам апатрапеічнай і прадуцыравальнай семантычнай скіраванасці гэтага рытуальнага атрыбута. «Знішчэнне гэтых вянкоў (выкідванне на могілках, у ваду, у касцёр і г. д.) сімвалізавала акт выгнання "русалкі"» [3, с. 317]. У в. Астрагляды зняты з русалкі вянок клалі на капусту, што, зыходзячы з народных вераванняў, спрыяла яе ўраджайнасці: «А потым баба брала вянок з галавы дзяўчыны і лажыла на капусту, каб капуста завязвалася» (запісана ў в. Кругавец-Калініна Добрушскага раёна ад Кабанчук Святланы Мікалаеўны, 1938 г. н., перасяленкі з в. Астрагляды). У в. Багушы выконвалі аналагічныя дзеянні з вянкамі, якія прыносілі дадому, «а патом маці брала іх, калі садзіла капусту, то вянок адзявала на каліва. Казалі, што так капуста будзе хутчэй расці і будзе вельмі добрая». У гэтай жа вёсцы русальныя вянкі закідваюць у жыта: «Гэта робяць для таго, каб быў харошы ўраджай» (запісана ў в. Жгунь Добрушскага раёна ад Кліменка Еўдакіі Якаўлеўны, 1929 г. н., перасяленкі з в. Багушы).

Звычайна на ролю русалкі выбіралі «прыгожую хуткую дзяўчыну з распушчанымі валасамі, прыбіралі яе кветкамі, на галаву надзявалі вянок» (запісана ў в. Буркі ад Раманюк Марыі Адамаўны, 1930 г. н.). У в. Пасудава гэту ролю выконваў мужчына: «На плячах вісело вецце дліннае-прэдліннае, бывало, што і долу цягалася. Ліца тожэ не было відно, бо ніхто не должэн яго бачыць. І вось ужо адзеты і разукрашаны ішоў мужчына гэты на кладбішчэ, чакаў там усю маладзёж» (запісана ў в. Малажын ад Сідзько Паліны Іванаўны, 1932 г. н., перасяленкі з в. Пасудава Брагінскага раёна).

З этнаграфічных апісанняў русальнай абраднасці вынікае, што арганічнымі кампанентамі структуры русальнага абраду

з'яўляюцца провады русалкі, яе пагоня за ўдзельнікамі гэтай абрадавай цырымоніі, уцёкі ад русалкі: «Русалку праводзім з дамоўкі да кінем у жыта, а самі ўцякаем, а яна гоніцца за намі» (запісана ў в. Лубенікі ад Гайдук Ганны Севасцьянаўны, 1922 г. н.); «Вянок несьлі і там вянок кідалі ў жыта, кідалі і ўцякалі ад русалкі. А яна ўжо нас лавіла, даганяла» (Надзея Ліцвіненка, 1946 г. н., в. Буркі, Брагінскі раён); «У нас маладзёж, дзевачкі, вяночкі вілі, надзявалі вяночкі і ішлі дзе-нібудзь у лес, на бугарочак і там хараводы вадзілі:

Мы заўём вяночкі на гады добрыя,
На жыта густое, на ячмень каласісты.

А ноччу ў этых вяночках русалку ганялі» (Анастасія Раманавец, 1932 г. н., в. Новы Пуць, Брагінскі раён) [2, с. 247–248]. «З праводзінамі русалак, як слушна адзначаў А. С. Ліс, заканчваліся абрады, звязаныя з веснавой парой года, і спяванне вясняных песень» [1, с. 54].

Калі рытуалы зімовай і веснавой абраднасці былі скіраваны на забеспячэнне ўраджайнасці нівы, то ў летні перыяд імкнуліся прыкласці ўсе намаганні, каб зберагчы і сабраць усё пасеянае на агародах і палях. У летнім цыкле земляробчага календара, які адрозніваецца паэтычнасцю народных вераванняў, захаванасцю рэшткаў старажытнага міфалагічнага светапогляду беларусаў, важнае месца займае Купалле, якое шырока святкавалася на Гомельшчыне, у тым ліку і ў вёсках Брагінскага раёна. Гэтае маляўнічае свята мела розныя назвы: «Купалле», «Іван Купальны», «Купала», «Іван вядзьмарскі». Сярод структурных кампанентаў купальскага абрадавага комплексу вылучаюцца такія, як збор лекавых раслін і кветак, пляценне вянкоў, запальванне вогнішча, ваджэнне карагодаў вакол кастра, пошукі папараці-кветкі, варажба, скокі моладзі праз вогнішча, звычай назіраць за ўзыходам сонца, калектыўнае купанне, варажба, прыкметы

і павер'і і інш. Што да збору купальскіх зёлак, то, паводле меркаванняў мясцовых жыхароў, іх лічылі лекавымі, таму «…іх асвячаюць і захоўваюць да следуюшчага году. Травы этыя нада былі для лячэння ўсякіх балезней» (запісана ў в. Лубенікі ад Гайдук Ганны Севасцьянаўны, 1922 г. н.). Жыхары в. Шкураты верылі, што менавіта травы, сабраныя на Купалле, «лепш лечуць, імі акурвалі хворых, брасалі ў печ, калі была граза, каб маланка не ўдарыла ў дом …» (запісана ад Злыдзенка Любові Мікітаўны, 1927 г. н.); «Зёлкі, сабраныя на Купалу, маюць цалебную сілу» (запісана ў в. Касачоў ад Прышчэп Юліі Аляксееўны, 1932 г. н.).

Магічнае значэнне надавалі агню купальскага кастра: «Обезацельно скакалі цераз касцёр, коб быць здоровымі. Казалі, што агонь кастру ачышчае і лечыць» (запісана ў в. Шкураты ад Саракаумавай Надзеі Раманаўны, 1948 г. н.). Купальскі агонь, паводле народных вераванняў, валодаў і засцерагальнымі якасцямі: «Пары, якія страчаліся між сабой, прыгалі цераз яго. Агонь як бы адганяў злых духаў ад іх» (запісана ў в. Касачоў ад Прышчэп Юліі Аляксееўны, 1932 г. н.).

Важнае месца ў сістэме купальскай абраднасці належыць вянкам, якія выкарыстоўваліся з мэтай варажбы аб шлюбе: «Дзяўчаты пускалі на ваду вянкі. Калі вянок паплыве – хутка замуж выйдзе, а калі ж патоне – дык сядзець ей цэлы год дома» (запісана ў в. Лубенікі ад Гайдук Ганны Севасцьянаўны, 1922 г. н.); «Потым вянкі ўскладалі на воду і глядзелі: куды ён паплыве, там судзьба» (запісана ў в. Буркі ад Раманюк Марыі Адамаўны, 1930 г. н.). Жыхары Брагіншчыны верылі, што купальскія вянкі валодаюць таксама магічнай сілай уплыву на ўрадлівасць глебы: «Маладыя плялі вянкі і кідалі вянкі. Гэта было для ўраджаю» (запісана ў в. Вуглы ад Найдзенка Клары Пятроўны, 1926 г. н.).

Як сведчаць фактычныя матэрыялы, у народнай памяці захаваліся сціплыя звесткі пра купальскі звычай назіраць

за ўзыходам сонца: «Пад раніцу ўсе ішлі сустракаць узыход сонца» (запісана ў в. Лубенікі ад Гайдук Ганны Севасцьянаўны, 1922 г. н.). Менавіта ў гэтай з'яве знайшлі адлюстраванне міфалагічныя ўяўленні нашых продкаў, паводле якіх сонца ўзыходзіла «іграючы». «Ясны ўзыход свяціла з пераліўным бляскам і лічылі за добры знак на ўрадлівае жніво» [1, с. 57]. Як падкрэсліла Р. М. Кавалёва, «калі сонца "іграе", своеасабліва зіхаціць, пераліваецца рознымі колерамі, то ў міфалагічным сэнсе гэта азначала, што яно задаволена шлюбам. А людзі спадзяваліся на тое, што спраўдзяцца іх надзеі на ўсталяванне парадку, на шчаслівае жыццё, на добры ўраджай» [4, с. 265].

Падчас святкавання Купалля прадугледжвалася і выкананне такога абавязковага рытуалу, як купанне моладзі ў рацэ, што мела засцерагальную семантыку: «Калі Купала, бягом ды купаемся» (запісана ў в. Зарэчча ад Карпенка Ніны Адамаўны, 1925 г. н.). На думку Р. М. Кавалёвай, «калектыўнае купанне моладзі ў рацэ зусім не было забавай ці рытуальным ачышчэннем: яно павінна было ўвасабляць купанне ў вадзе (= шлюбнае аб'яднанне з зямлёю) самога сонца. Містэрыяльная падзея знайшла адлюстраванне ў песнях, дзе гаворыцца, што сонейка доўга ў моры гуляла ці доўга там купалася» [4, с. 265].

Пра пошукі цудадзейнай папараці-кветкі жыхары Брагіншчыны прыгадвалі шмат цікавых звестак, сцвярджаючы пры гэтым, што «ішлі шукаць тую кветку, яна дапамагае ўсё ведаць, але ніхто яе не бачыў» (запісана ў в. Сцежарнае ад Кабанчук Святланы Мікалаеўны, 1938 г. н.). Традыцыйны матыў абрадавага моманту пошукаў гэтай кветкі, звязаны з тым, што чалавек становіцца шчаслівым, набывае фантастычныя якасці далучацца да жыцця прыроды, знайшоў адметнае ўвасабленне ў мясцовых легендах і павер'ях: «Шукаюць уначы папараць-кветку, каб прынесці дамоў і штоб шчасце было і ўсё добра» (запісана ў г. п. Камарын ад Гаўрыленка Марыі Іванаўны,

1937 г. н.), «Ета было ў купальскую ноч, калі сонца стала ўсходзіць, то ён прачнуўся да й сам сябе не пазнаў. Ведае, дзе каровы, чуе, што кругом гаворыць усякае дзерава, усякі звер і пціца» (запісана ў в. Бакуны ад Марчанка Ніны Андрэеўны, 1931 г. н.).

Калі з інфармантамі вялася гаворка пра Купалле, то яны абавязкова прыгадвалі звесткі і пра свавольствы моладзі, якія мелі месца на гэтым свяце: «Вырываюць лавачкі, уносяць к другому, ставяць. Назаўтра хазяін выйдзе, а ў яго хвортк і няма, пайшоў глядзець, а яна ў другога вісіць на заборы» (запісана ў в. Буркі ад Шкурко Ганны Адамаўны, 1926 г. н.); «Яшчэ была такая ў нас навенцыя: хто пойдзе первы эты год замуж, да й німа дзіцяці – калыску ўсегда вешалі перад акном на Івана. Зробяць ляльку, зробяць козла такія на тры палкі да павесяць ту калыску» (Марыя Чэчка, 1928 г. н., в. Бярозкі, Брагінскі раён. Зап. І. Мазюк) [2, с. 321].

На пытанне, як засцерагаліся ад ведзьмы ў купальскую ноч, жыхары Брагіншчыны ў асноўным распавядалі пра крапіву-жыгучку як магічны сродак, з дапамогай якога можна было іх адпалохаць: «Трэба было крапіву на хлеў вешаць, каб вядзьмарка карову не падаіла» (запісана ў в. Сцежарнае ад Шаўчэнка Таццяны Дзмітрыеўны, 1932 г. н.), «Гаспадыні вешалі па хлявах крапіву, каб ведзьма не магла зайсці ў хлеў і забраць у кароў малако» (запісана ў в. Лубенікі ад Гайдук Ганны Севасцьянаўны, 1922 г. н.).

Жніўная абраднасць на Брагіншчыне, як і ў іншых раёнах Гомельшчыны, уключала зажынкі, уласна жніво і дажынкі. Зажынкі ў народнай свядомасці ўспрымаліся як свята, да якога павінны былі добра падрыхтавацца, асабліва навесці парадак у хаце, усё чыста вымыць: «Перад зажынкамі мыўся пол, бялілася печ, засцілаўся чысты абрус, усе апраналіся ў вышыванае красівае адзенне» (запісана ў в. Лубенікі ад Гайдук Ганны Севасцьянаўны, 1922 г. н.). У в. Лубенікі на ролю

жняі-зажынальніцы выбіралі вопытную старую жанчыну, «маладым нельга было зажынаць» (запісана ад Касцючэнка Вольгі Васільеўны, 1930 г. н.). Іншы раз рытуал зажынання першых каласоў выконвала жанчына, якая «дужая была. Яна первая пажне, а тады ўжо астальныя ідуць у поле» (запісана ў в. Чамярысы ад Краўчанка Наталлі Міхайлаўны, 1938 г. н.). У в. Малажын выбіралі ў якасці жняі-зажынальніцы «самую шчырую такую, рабацяшчую, здаровую… Самую счаслівую, … канешна, не ўдаву, а парную якую, штоб у першы дзень зажала сноп. Штоб было ўдачнае жніво» (запісана ад Харко Валянціны Аляксандраўны, 1939 г. н.).

Абавязковым атрыбутам зажынак былі хлеб з соллю: «Када зажынаюць жыта, то пякуць хлеб. З первай кулідкі адразаюць акрайчык хлеба, затыкаюць туды соль. … Ад кулідкі баба прыносіць на поле і ложыць яго на гэты крэст з жыта. Гэта было як закон» (запісана ад Касцючэнка Вольгі Васільеўны, 1930 г. н.). «Усё, што здзяйсняла жняя-зажынальніца, было скіравана на тое, каб жніво прайшло добра і зжатая ніва дала жаданы спор, багаты ўраджай» [1, с. 60].

Першы сноп называлі «гаспадаром», і «яго маглі ставіць на покуці» (запісана ў в. Лубенікі ад Гайдук Ганны Севасцьянаўны, 1922 г. н.). Пасвечанае ў царкве зерне з гэтага снапа выкарыстоўвалі затым вясною для сяўбы.

Завяршалі жніво дажынкі, выкананне рытуалаў якіх было скіравана на забеспячэнне ўраджайнасці нівы ў будучым годзе. Падрыхтоўка вянка і абрад «завіванне барады» – важныя складаемыя дажынкавай абраднасці: «Астаўляем тры каласкі, барада называлася. Там натыкаем разных цвятоў, песні пяем» (запісана ў в. Карлаўка ад Петрасевіч Ефрасінні Фролаўны, 1911 г. н.), «То, што ні дажалі, дажыналі і ў кучачкі складалі, нітачку завяжам красненькую, акрайчык хлеба паложам… А тады і дзелаем вянок…» (запісана ў г. п. Камарын ад Анціпавай Яўгеніі Васільеўны, 1918 г. н.).

Прааналізаваныя матэрыялы па каляндарна-абрадавай паэзіі Брагіншчыны даюць магчымасць пераканацца ў важнасці вывучэння іх мясцовай спецыфікі, бо выяўленыя лакальныя асаблівасці народнага календара ўзбагачаюць агульнаэтнічную фальклорна-этнаграфічную спадчыну.

## *КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА*


1. Zemlarobchy kaljandar: *Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі* / уклад., класіф., сістэм. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага ; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса; рэдкал. : А. С. Фядосік (гал. рэд.) і інш. Мінск, 1990. 405 с.

2. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн. Кн. 1. / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. Мінск, 2012. 910 с.

3. Славянские древности: этнолингвистический словарь : в 5 т. / под ред. Н. И. Толстого. Т. 1 : А–Г. Москва, 1995. 584 с.

4. Кавалёва Р. М. Паэзія беларускага Купалля. Нарысы гісторыі і культуры Беларусі : у 4 т. Т. 3. Культура сяла XIV – пачатку XX ст. Кн. 2. Духоўная культура / А. І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А. І. Лакотка. Мінск : Беларуская навука, 2016. 751 с.


## *REFERENCES*


1. Agricultural calendar: Rites and Customs. The materials are compiled, classified, systematized and commented by A. GURSKIY; prefatory article by A. GURSKIY and Arseniy LIS; editorial board: Anatoly FYADOSIK (ed.-in-chief), et al. Minsk, 1990, 405 pp. [in Belorussian].

2. Traditional Artistic Culture of Belarusians: In Six Volumes. Vol. 6. Gomel Polesie and Dnieper Lands. In two books. Book 1. Tatsiana VALODZINA [et al.]; idea and general editing by T. VARFALAMEEVA. Minsk, 2012, 910 pp. [in Belorussian].

3. TOLSTOI, Nikita, ed. Slavic Antiquities: Ethnolinguistic Dictionary: In Five Volumes. Vol. 1: А–Г. Moscow, 1995, 584 pp. [in Russian].

4. KAVALEVA, Rimma. Poetry of the Belorussian Kupala. In: LAKOTKO, Aleksandr, et al. LAKOTKO, Aleksandr, scientific editor. *Essays on the History and Culture of Belarus*: In Four Volumes. Vol. 3. The Culture of the Village in the Fourteenth – Early Twentieth Century. Book 2. Spiritual Culture. Minsk, Belorussian Science, 2016, 751 pp. [in Belorussian].

## *SUMMARY*

Regional and local peculiarities of separate phenomena of spring and summer cycles in the agricultural calendar are considered in the article on the base of a rich actual material recorded on the territory of Brahin district in Gomel region during a field expedition in 2018.

The authoress notes that the data provided by the informants about the rite of the so-called Spring meeting (*inviting* or *calling out*) is presented decently. According to the field expeditionary materials, it is possible to reconstruct this rite and imagine its structural components: reaching a high place, making a fire, choosing a girl, symbolizing the spring coming, vesnianky singing.

Easter has been the most widely celebrated in Brahin district. The materials recorded in different localities give an opportunity to emphasize such structural elements of Easter ritual complex as the rites performed on Maundy Thursday, baking a ceremonial bread – Easter cake, colouring Easter eggs, attending a night divine service in church; consecration of eggs, Easter cake and other ceremonial food, ritual actions with Easter eggs, a rite, connected with the godparents' visit to their godchildren.

The fact that Easter ceremonies and customs have expressive local semantics is confirmed in the article by concrete records. It is verified by symbolic protective and production ritual actions.

George (Yuriy) ritual complex is significant by both agricultural and stock-raising trends. Agricultural cycle of the George (Yuriy) rites is represented by the ceremony of the passing around the cornfield. The first cattle pasture is very notable in Brahin district. As a rule, the cow is put into the pasture with the help of consecrated bread, salt and willow branches.

Summer cycle of the agricultural calendar in Brahinshchina is distinguished by the poetry of folk beliefs and preservation of mythological ideas. An important place is given to the celebration of Kupala holiday. The medicinal plants and flowers gathering, wreaths weaving, making a fire, dancing around the fire, searching for a mythical fern flower, fortune telling, young people jumping over the fire, the custom to watch the sunrise, joint swimming in the river, signs and beliefs, etc. are emphasized among the structural components of Kupala ritual complex.

On the territory of Brahin district as well as in the other Gomel districts, rituals devoted to the harvest time include such holidays as reaping

starting (*zazhynki*) and reaping finishing (*dozhynki*). Such constituent elements of *dozhynki* as wreath preparation and the harvest festival (*zavyvannia borody*) have finished the harvest time.

The study of folklore traditions of separate regions in Belarus, particularly the districts of Gomel region, is important for the preservation of unique local ritual culture as well as for the enrichment of general ethnic folklore-ethnographic heritage.

**Keywords**: rite, calendar-ritual poetry, folk beliefs, Easter ritual complex, harvesting rites, Trinity-Semitz rites, local peculiarities.